# СТАЦЬ «ПАЛЯВЫМ ІГРАКОМ»

## У супрацоўніцтве з ШАС наша краіна не будзе назіраць з «лаўкі запасных»

**Завяршыўся рабочы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Ташкент. У сталіцы Узбекістана Прэзідэнт прыняў удзел у пасяджэнні савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Гэта быў першы саміт ШАС, у якім Беларусь прыняла ўдзел на вышэйшым узроўні ў новым статусе назіральніка.**



Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін.

Фота БЕЛТА.

У сваім выступленні на саміце беларускі лідар заявіў аб намеры Беларусі актыўна ўдзельнічаць у рабоце арганізацыі па ўсіх кірунках, якія маюць узаемны інтарэс. «Цвёрда перакананы ў тым, што ШАС з'яўляецца запатрабаванай перагаворнай пляцоўкай для калектыўнай выпрацоўкі механізмаў процідзеяння сучасным выклікам і пагрозам», — адзначыў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, другім магістральным напрамкам узаемадзеяння ў рамках ШАС павінна стаць эканамічная кааперацыя. Кіраўнік беларускай дзяржавы зрабіў акцэнт і на неабходнасці ўзаемадзеяння Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва з Еўразійскім эканамічным саюзам.

«Як краіна-назіральнік у ШАС мы не збіраемся, гаворачы спартыўнай тэрміналогіяй, сачыць за гульнёй з «лаўкі запасных». Беларусь гатова стаць актыўным «палявым іграком» на прасторы арганізацыі і ўнесці важкі ўклад у яе работу», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У Ташкенце таксама адбыліся двухбаковыя перагаворы беларускага лідара са Старшынёй КНР і прэм'ер-міністрам Індыі. Бакі абмеркавалі пытанні па развіцці гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі перспектыўных праектаў.

Падчас сустрэчы з Сі Цзіньпінам кіраўнік беларускай дзяржавы запэўніў, што як Кітай, так і ШАС у цэлым могуць разлічваць на падтрымку Беларусі ў любых пытаннях. «Мы гатовы быць «заходнімі варотамі» гэтай арганізацыі», — заявіў беларускі лідар. У якасці прыкладу таго, як Беларусь паслядоўна выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы, Аляксандр Лукашэнка прывёў рэалізацыю праекта па стварэнні Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». «Як вы яго назвалі, гэта жамчужына Вялікага шаўковага шляху. Мы будзем рабіць усё і робім цяпер, каб гэты праект быў напоўнены эканамічным зместам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Сі Цзіньпін павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з паспяховым правядзеннем пятага Усебеларускага народнага сходу і адзначыў, што беларуска-кітайскія адносіны імкліва набіраюць абароты, і па ўсіх пытаннях бакі падтрымліваюць адзін аднаго. Сі Цзіньпін таксама выказаў падтрымку намаганням, нацэленых на спакойнае правядзенне парламенцкіх выбараў у нашай краіне. Ён запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Кітай з дзяржаўным візітам і заявіў аб гатоўнасці далейшага паглыблення супрацоўніцтва па ўсіх кірунках.

На сустрэчы з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндра Дамадардасам Модзі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што беларуска-індыйскім адносінам неабходна надаць дадатковы імпульс. «У нас ёсць добрыя кірункі супрацоўніцтва, але я лічу, што на гэтым спыняцца нельга. Трэба рухацца наперад. І мы, вядома ж, чакаем вашай большай прысутнасці ў цэнтры Еўропы. Для вялікай Індыі гэта будзе нядрэнна, і мы гатовы рэалізаваць вашы інтарэсы ў Беларусі настолькі, наколькі гэта вам выгадна», — сказаў беларускі лідар.

**Паводле БЕЛТА.**

## ■ Парламенцкі дзённік

# ЦІ СТАНЕ БОЛЬШ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ?

## ПРЫНЯТЫ ПРАЕКТ КОДЭКСА, АНАЛАГАЎ ЯКОМУ НЯМА Ў СВЕЦЕ

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў другім чытанні прынялі праект Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры. Ён будзе рэгуляваць грамадскія адносіны ў сферы культуры па такіх напрамках, як творчая дзейнасць, ахова гісторыка-культурнай і археалагічнай спадчыны, бібліятэчная і музейная справа, народныя мастацкія рамёствы, кінематаграфічная дзейнасць, арганізацыя і правядзенне культурных мерапрыемстваў... Гэты дакумент — унікальны не толькі для нашай краіны. Яму, як адзначаюць распрацоўшчыкі, увогуле няма аналагаў у свеце.**

Праект Кодэкса аб культуры складаецца з Агульнай і Спецыяльнай частак, пяці раздзелаў, 257 артыкулаў.

**Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы,** у размове з карэспандэнтам «Звязды» паведаміла, што да таго, як Кодэкс запрацуе, ён павінен быць прыняты Саветам Рэспублікі і падпісаны Прэзідэнтам.

— Дакладна сказаць, калі ён пачне дзейнічаць, не магу, але ўпэўнена, што гэта адбудзецца сёлета — бо зараз Год культуры, — сказала Наталля Кучынская. — Так што ў 2017 годзе Кодэкс ужо будзе працаваць.

У праекце Кодэкса вызначаны змест дзяржаўнай палітыкі і кампетэнцыя дзяржаўных органаў у сферы культуры. Так, сёння напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляюцца: стварэнне ўмоў для супрацоўніцтва дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прыцягненне сродкаў спонсараў і мецэнатаў культуры, іншых юрыдычных асоб і грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў... У той жа час захоўваецца фінансаванне сферы культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

Кодэкс спрашчае парадак прыняцця некаторых кіраўніцкіх рашэнняў. У прыватнасці, да кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога ўзроўню аднесена прыняцце рашэнняў аб наданні культурным каштоўнасцям, якія маюць значнасць для асобнага рэгіёна, статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама прыняцце рашэнняў аб пазбаўленні іх такога статусу.

Адказваючы на пытанне пра тое, ці стане ў сувязі з гэтым новаўвядзеннем больш аб'ектаў са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці, Наталля Кучынская выказала спадзяванне, што такіх аб'ектаў павінна прыбавіцца:

— Людзі ў сферы культуры актыўныя. Увогуле, гэта вельмі важны нюанс: у кожным рэгіёне ёсць значныя культурныя аб'екты.

Яшчэ адно новаўвядзенне — у праекце Кодэкса прадугледжаны больш сур'ёзныя патрабаванні да стварэння музеяў. Абавязковае патрабаванне — магчымасць увядзення штатнай адзінкі (адзінак) музейнага работніка. Спрашчаецца парадак стварэння музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам: не патрабуецца прыняцця рашэнняў Прэзідэнта або Савета Міністраў.

У сваім выступленні ў авальнай зале дэпутат Наталля Кучынская звярнула ўвагу і на тое, што ў Кодэксе прадугледжана магчымасць вяртання ўваходных білетаў «у выпадку змянення складу ўдзельнікаў ці змянення месца і часу правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства». Кампенсацыя кошту білета ў поўным памеры будзе выплачвацца не пазней чым за сем каляндарных дзён з дня падачы заявы.

### Карыстацца авіямадэлямі стане прасцей

Учора дэпутаты ўхвалілі змены і дапаўненні і ў іншы грунтоўны дакумент. Пра новаўвядзенні ў Паветраны кодэкс нашай краіны расказала **Алена БЕРАСНЕВА, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.**

— На практыцы спрашчаецца выкарыстанне авіямадэляў у паветранай прасторы, іх не трэба будзе рэгістраваць, гэта значыць, усё будзе нашмат прасцей, — паведаміла парламентарый. — Пасля таго, як мы прымем адпаведныя змены ў заканадаўства, выкарыстанне авіямадэляў будзе рэгламентавацца не Паветраным кодэксам нашай краіны, а правіламі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якія зараз распрацоўваюцца.

### Дадатковыя паўнамоцтвы

**Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі,** расказаў пра змены ў Закон «Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

— Законапраектам прапануецца дэ-юрэ замацаваць такія прынцыпы арганізацыі адвакатуры, як самакіраванне і самафінансаванне, а таксама адзінства статусу адвакатаў, — адзначыў ён. — Сёння рэспубліканская калегія адвакатаў фармальна аб'ядноўвае ўсіх членаў калегіі, але не мае такіх кіруючых паўнамоцтваў, як тэрытарыяльныя калегіі. Таму неабходна павысіць ролю рэспубліканскай калегіі адвакатаў, якая павінна не толькі каардынаваць работу тэрытарыяльных калегій адвакатаў, але і здзяйсняць аператыўнае кіраванне некаторымі пытаннямі дзейнасці ўсёй адвакатуры ў краіне.

### Бюджэт прыйдзецца карэктаваць

Парламентарыі разгледзелі шэраг законапраектаў, прысвечаных зацвярджэнню справаздач аб выкананні бюджэтаў дзяржаўных пазабюджэтных фондаў. Адказваючы на пытанне дэпутата Валянціны Ляоненкі, члена Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, **Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў,** прызнаў, што сёлета, на жаль, нестабільнасць знешніх фактараў, змяненне цэн на нафту ўплываюць на выкананне бюджэту.

— Нам прыйдзецца яго карэктаваць па выніках першага паўгоддзя, таму што цэны на нафту не адпавядаюць прагнозным значэнням, ёсць і іншыя адхіленні, — паведаміў міністр фінансаў. — Мы ўжо зарэзервавалі частку расходаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў для таго, каб збалансаваць бюджэт з улікам умоў, што змяняюцца.

Па словах міністра, меры па дадатковым прыцягненні ў бюджэт даходаў прынятыя. Уладзімір Амарын запэўніў, што бюджэт збалансаваць атрымаецца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ■ Тры пытанні да ўлады

# Неглюбка стала брэндам

**Больш чым на палову скарацілася насельніцтва Веткаўшчыны з сумна вядомага 1986 года. Самы набліжаны да Гомеля райцэнтр, як і ўвесь раён, моцна пацярпеў ад наступстваў Чарнобыля. Тым не менш сёння можна ўпэўнена казаць, што раён перайшоў ад пераадолення наступстваў аварыі да дынамічнага развіцця. Тут ёсць пэўныя поспехі, якімі ганарацца тыя, хто тут жыве і працуе. У апошні час сродкі скіраваны на развіццё сельскай гаспадаркі. Уведзены ў эксплуатацыю жывёлагадоўчыя комплексы ў Янове, Тарасаўцы, Неглюбцы і Хальчы, вядзецца будаўніцтва птушкафабрыкі магутнасцю 20 тысяч тон у год. Флагманам у раёне з'яўляецца СВП «Свяцілавічы». Летась прадпрыемства заняло першае месца па гаспадарча-эканамічнай дзейнасці ва ўсёй рэспубліцы. <u>Старшыня Веткаўскага раённага выканаўчага камітэта Алег АРХІПЕНКА</u> нядаўна заняў сваю пасаду. Ён падкрэслівае, што толькі дзякуючы арганізацыі працы раён паступова становіцца лідарам у сельгасвытворчасці. Пры гэтым нагадвае, што бал урадлівасці глебы ў раёне нізкі — 28. І ўсё ж летась веткаўчане занялі трэцяе месца ў вобласці па выхаду збожжа з аднаго бала гектара і другое — па нарыхтоўцы кармоў на ўмоўную галаву.**



***— Ведаю, што дагэтуль Веткаўскі раён не поўнасцю газіфікаваны. Што робіцца ў гэтым напрамку?***

— За постчарнобыльскі перыяд у раёне падведзены прыродны газ у самой Ветцы і 14 сельскіх населеных пунктах — пракладзена амаль 300 км газавых сетак. Аднак праблема газіфікацыі прыродным газам вырашана не поўсюль. Патрэбна працягваць газазабеспячэнне паўночна-ўсходняй часткі раёна. Там знаходзяцца чатыры аграгарадкі: Неглюбка, Янова, Малыя Нямкі і Стаўбун. Калі атрымаецца правесці газіфікацыю, якая прадугледжана Дзяржпраграмай па пераадоленні наступстваў катастрофы, будуць вырашаны і задачы паляпшэння экалагічнага становішча раёна за кошт выкарыстання чыстага паліва, стварэння неабходных санітарна-бытавых умоў пражывання. У Свяцілавічах сёлета плануецца газіфікаваць 80 дамоў. Між тым у самім райцэнтры трэба правесці рэканструкцыю каналізацыі і ачышчальных збудаванняў. Патрабуе рэканструкцыі і сістэма водазабеспячэння раёна. Цяпер за асабістыя сродкі мясцовы КЖРУП робіць рамонт каля 300 метраў водаправода ў аграгарадку Старае Сяло. Многім аб'ектам інфрастуктуры горада Ветка сённе патрэбна аднаўленне. Запланавана правесці рамонт гарадскога дома культуры, аддзяленняў радзільнага і рэабілітацыі раённай бальніцы. Прыйшло ў непрыгоднасць і дзіцячае аддзяленне, якое патрабуе сур'ёзнай рэканструкцыі. На сёлета запланавана правесці рамонт дзіцячага садка, дзе цяпер выхоўваецца каля 60 дзетак.

***— Як вырашаецца праблема занятасці ў райцэнтры, да якога дабірацца 20 хвілін на маршрутцы?***

— На сённяшні дзень у нас вакансій больш, чым тых, каму яны патрэбны. У раёне патрэбны настаўнікі, супрацоўнікі аховы здароўя, праваахоўнікі. Да нас штодзень прыязджаюць на працу многія спецыялісты, у тым ліку і кіраўнікі, з Гомеля. Жыхары абласнога цэнтра запаўняюць вакансіі ўрачоў, настаўнікаў, міліцыянераў, а вось мясцовыя чамусьці ад'язджаюць у горад. Гэта агульная тэндэнцыя малых гарадоў. Многія лічаць, што толькі ў вялікіх гарадах ёсць жыццё, а ў вёсках людзі дажываюць. Хоць мне здаецца, гэта не так. Сёння ў нас на месцах ёсць усё неабходнае: добрая заработная плата, жыллё і ўся неабходная інфраструктура. Дарэчы, тыя, хто мае жыццёвы вопыт, не імкнуцца ў горад — наадварот.

***— Веткаўскі музей стараабраднецтва і беларускіх традыцый ведаюць далёка за межамі раёна, вобласці і нават Беларусі. Але ж зусім нядаўна ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі трапілі неглюбскія тэкстыльныя традыцыі. Хаця, здаецца, знаўцы заўсёды захапляліся ручнікамі вытворчасці майстроў з вёскі Неглюбка.***

— Так, вельмі прыемна, што на агульнадзяржаўным узроўні неглюбскія белачырвоныя ручнікі прызнаны брэндам Беларусі. Рашэнне па прысваенні такога статусу было прынята Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Тэкстыльная традыцыя вёскі Неглюбка — унікальная з'ява беларускай народнай творчасці, якая з'яўляецца візітнай карткай краіны. Багацце і разнастайнасць тэхнік ткацтва і вялікі арнаментальны фонд — адметныя асаблівасці ручніка з Неглюбкі. Майстры выкарыстоўваюць некалькі дзясяткаў складаных геаметрычных і раслінных арнаментаў. Адметная тэкстыльная традыцыя ў вёсцы сёння не толькі існуе, але і актыўна развіваецца. Сучасныя майстры навучаюць маладое пакаленне характэрным для неглюбскай традыцыі тэхналогіям у гуртках, арганізаваных пры Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва, у неглюбскай школе, у гуртку ткацтва Веткаўскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*